

THE NEW YORK TIMES BESTSELLER
SCOTT SNYDER RAFAEL ALBUQUERQUE
AMERICAN VAMPIRE
8
Dec '10
3.99 us
suggested for
mature readers
vertigocomics.com
VERTIGO
BY COMICS
АМЕРЫКАНСКІ ВАМПІР #8
ПЕРАКЛАД І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY



Амерыканскі Вампір

Д'ябл у пясках (частка трэцяя)

Скот Снайдэр, Дэйв Маккейг, Рафаэль Альбукерке, Марк Дойль.
Ідэя Стывена Кінга

BY COMICS
Пераклад на беларускую мову - ComicsBY.by


ВЫ ЗАЎСЁДЫ БЕРАЦЕ ЗБРОЮ, КАБ ПРОСТА ПА-ГУТАРЫЦЬ?
КАЛІ ЗБІРАЕМСЯ ПАГУТАРЫЦЬ З ВАМПІРАМ, ЗАЎСЁДЫ.
ЯКІЯ, ДА ЧОРТА, ВАМПІРЫ? ВЫ АБ ЧЫМ? ВЫ НАОГУЛ ХТО? Я...
ГЕНРЫ...
...УСЁ ДО-БРА. Я ЧАКА-ЛА ЧАГОСЬЦІ ПАДОБНАГА.


А Ў ВАС МІЛЫ...
ЧАГО ВЫ ХАЦІЦЕ?
ДА СПРАВЫ, КАНЕШНЕ.
МЯНЕ КЛІЧУЦЬ ЛІНДРЭН ХОБС, А ГЭТА – АБІЛЕНА БУК.
МЫ ПРАЦУЕМ НА АРГАНІЗАЦЫЮ ПАД НАЗВАЙ ВАСАЛЫ РАНІШНЯЙ ЗОРКІ. МНОГІЯ ПРАДСТАЎНІКІ ВАШАГА ВІДУ ЗНАЁМЫ З НАМІ І НАШАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ.
ВЫ, Я СПАДЗЯЮСЯ, ТАК САМА?


ПРАБАЧЦЕ, АЛЕ Я НЕ Ў ТЭМЕ.
ВЫ З'ЯЎЛЯЕЦЕСЯ СЮДЫ СА ЗБРОЯЙ, КАЖАЦЕ ПРА МОЙ «ВІД», АДПАВЕДНА ВЫ - ПАЛЯЎНІЧЫЯ НА ВАМПІРАЎ.
БЛІЗКА. МЫ ЗАБІВАЕМ ВАМПІРАЎ. МЫ ЗАЙМАЕМСЯ ГЭТЫМ ВЕЛЬМІ ПРАЦЯГЛЫ ЧАС І З'ЯЎЛЯЕМСЯ Ў ГЭТЫМ ПРАФЕСІЯНАЛАМІ, СУР'ЁЗНА.
ГУЧЫЦЬ, БЫЦЦАМ ВЫ ВЫХВАЛЯЕЦЕСЯ. А Я ЧУЛА, БРЫТАНЦЫ ВЯДОМЫ СВАІМІ МАНЕРАМІ...
НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ, СПАДАРЫНЯ ДЖОНС. МЫ Б НЕ ЗМАГЛІ ЗАБІЦЬ ВАС, НАВАТ КАЛІ Б ХАЦЕЛІ. ТАМУ МЫ ТУТ.
ЯК ВЫ ВЕДАЕЦЕ, КОЖНЫ РОД ВАМПІРАЎ МАЕ СВАЁ ПАТАГЕНІЧНУЕ СЛАБОЕ МЕСЦА, АСАБЛІВУЮ СЛАБАСЦЬ, ЯКАЯ ХАРАКТЭРНА ТОЛЬКІ ДЛЯ ГЭТЫХ АСОБ. ДРЭВА, ЖАЛЕЗА, СТАЛЬ.
МЫ ХАЦІМ, КАБ ВЫ СКАЗАЛІ НАМ ВАШУ.
СКАЖАМ ПРАМА - ВЫ ХАЦІЦЕ, КАБ Я СКАЗАЛА ВАМ, ЯК МЯНЕ ЗАБІЦЬ?


Лас Вегас, Невада.
ДОСЫЦЬ! ХОПІЦЬ ІЛГАЦЬ МНЕ!
ВЕДАЮ, У ГЭТА ЦЯЖКА ПАВЕРЫЦЬ, АЛЕ ЯКАЯ ІНШАЯ ІСТОТА МАГЛА ЗРАБІЦЬ ТАКОЕ?
МНЕ ЎСЁ ЗРАЗУМЕЛА. ВЫ ХАЦІЦЕ СКАЗАЦЬ, ШТО ВАМПІР ВЫСМАКТАЎ ДАНІЭЛЯ ФІЛМАТА ДА СМЕРЦІ.
АЛЕ, НА МАЮ ШЧАСЦЕ, ВЫ АБОДВА НАЛЕЖЫЦЕ ДА ВЯЛІКАЙ САКРЭТНАЙ І ВЕЛЬМІ СТАРОЙ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКАЯ ЗАЙМАЕЦЦА ЗНІШЧЭННЕМ ВАМПІРАЎ.
ШЭФ МАККОГАН...
ГЭТА Я ЎДАКЛАДНЯЮ ДЛЯ МАЙГО ЗАЎТРАШНЯГА ЗВАНКА ВА ЎПРАЎЛЕННЕ ШТАТА, КАБ АБВІНАВАЦІЦЬ ВАС У НЕЗАКОННАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АД ІМЯ ФЕДЭРАЛЬНЫХ АГЕНТАЎ.
НУ А ПАКУЛЬ Я НЕ МАЮ ДАКЛАДНЫХ ЗВЕСТАК ПРА ТОЕ, ХТО ВЫ НА САМОЙ СПРАВЕ, **ГЭТА** – МАЯ ЮРЫСДЫКЦЫЯ І ВЫ БОЛЬШ НЕ БУДЗЕЦЕ ЗАМІНАЦЬ МАЙМУ РАССЛЕДАВАННЮ. ЗРАЗУМЕЛА?
А ЗАРАЗ, КАЛІ НЕ СУПРАЦЬ, У МЯНЕ ЯШЧЭ АДНО ЗАБОЙСТВА, ПРА ЯКОЕ ТРЭБА ПАВЕДАМІЦЬ.


Я ТОЛЬКІ ХАЦЕЛА СКАЗАЦЬ ВАМ…
СКАЗАЦЬ ШТО? ШТО Ў АПАЧЫ ВУРДАЛАКІ, А Ў РЫТЦЭ ГОБЛІНЫ? Я ЗАПІШУ ДЛЯ ПРАТАКОЛА.
ШТО МОЙ БАЦЬКА ТАКСАМА СЛУЖЫЎ ЗАКОНУ.
ЯГО ЗВАЛІ **ДЖЭЙМС БУК**. ЁН ТАКСАМА ЗАГІНУЎ ПРЫ ВЫКАНАННІ.
ЯГО ЗАБІЎ ДЖЫМ СМОК, ЦІ СКІНЭР СВІТ, ЯК ЯГО ТАДЫ КЛІКАЛІ. СВІТ ЗАРАЗІЎ ЯГО СВАЁЙ КРЫВЁЙ, І МОЙ БАЦЬКА ПАМЁР У БАРАЦЬБЕ З ГЭТАЙ ІНФЕКЦЫЯЙ ПЕРАД ТЫМ, ЯК ЯНА ЗРАБІЛА ЯГО МОНСТРАМ.
Я ВЕДАЮ, ШТО ВЫ ДУМАЕЦЕ ПРА ЎСЁ ГЭТА, АЛЕ Я КЛЯНУСЯ, ШТО ТУТ НЯМА **ВЫДУМКІ**. УСЁ РЭАЛЬНА НАСТОЛЬКІ, НАКОЛЬКІ МОЖА БЫЦЬ.
ВЫ СКОНЧЫЛІ?
ТАК, Я СКОНЧЫЛА. ТОЛЬКІ ПАМЯТАЙЦЕ, ШТО Ў СВЕЦЕ ЁСЦЬ ЗЛО. САПРАЎДНАЕ ЗЛО. ВЫ МОЖАЦЕ ЗМАГАЦЦА З ІМ, А МОЖАЦЕ ХАВАЦЦА І ПРЫКІДВАЦЦА, ШТО ЯГО НЕ ІСНУЕ. АЛЕ, ТАК ЦІ ІНАЧ, ВАМ ТРЭБА БЫЦЬ ПАДГАТАВАНЫМ…


«БО ЯНО ЎЖО ПРЫЙШЛО Ў ВАШ ГОРАД. МОЖАЦЕ МНЕ ПАВЕРЫЦЬ».
ПРАБАЧ-ЦЕ...
MURDER AT THE PEABODY HOTEL!
ПРАШУ ПРАБАЧЭННЯ, Я НЕ ПАЧУЎ...
...ЯК ВЫ ВАЙШЛІ.
МЫ Б ХАЦЕЛІ АТРЫМАЦЬ ПАРУ ПАКОЯЎ...


«У ВАС ЁСЦЬ ПАКОІ БЕЗ ВАКОН?»
У ЧУЎ ДАСТАТКОВА. ЗЫХОДЗЬЦЕ АДСЮЛЬ!
ЛЯГЧЭЙ, РАМЭО.
КАЛІ ВЫ ДАЗВОЛІЦЕ МНЕ СКОНЧЫЦЬ, МІСТАР ПРЭСТАН...
СУПАКОЙЦЕСЯ, ЛЮДЗІ!
А ЗАРАЗ МІСТАР ХОБС, ЛІНДЭН...
НАВАТ КАЛІ ЎЯВІЦЬ, ШТО Я ВЕДАЮ МАЮ «СЛАБАСЦЬ», ЧАМУ Б Я СТАЛА РАСКАЗВАЦЬ ВАМ ПРА ЯЕ?
Я НЕ БУДУ ПРЫКІДВАЦЦА, Я ВАШ ВОРАГ. Я ВЕРУ, ШТО КРОЎ, ЯКАЯ ЦЯЧЭ ПА ВАШЫХ ЖЫЛАХ, ПА ПРЫРОДЗЕ СВАЁЙ ЧОРНАЯ І ПРАКЛЯТАЯ, І ШТО ВАШ ВІД – АДХІЛЕННЕ АД ПРЫРОДНАЙ ІСНАСЦІ.
Я ПРЫСВЯЦІЎ СВАЁ ЖЫЦЦЁ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯДЗІНАЙ МЭТАЙ ЯКОЙ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ПОЎНАЕ І ТАТАЛЬНАЕ ЗНІШЧЭННЕ ВАМПІРАЎ – УСІХ ВАС, УСІХ РАДОЎ.
АЛЕ ЧАС АД ЧАСУ Я СКЛАДАЮ ЎГОДЫ З АДНІМІ ПРАДСТАЎНІКАМІ ВАШАГА ВІДУ, КАБ МЕЦЬ БОЛЬШ ЗНАЧНЫЯ АРГУМЕНТЫ Ў РАЗМОВАХ З ІНШЫМІ.


ВЫ ПАЛЮЕЦЕ НА СКІНЭРА, ТАК?
ТАМУ ВЫ ТУТ.
ПАЧАКАЙЦЕ, ЗДАГАДАЮСЯ. ВЫ НЕ МАГЛІ ЯГО ЗАБІЦЬ, І ЗАМЕСТ ГЭТАГА ВЫ ПАСПРАБАВАЛІ ДАМОВІЦЦА З ІМ...
І ЯК, ГЭТА ДАПАМАГЛО ВАМ?
КАЛІ ВЫ ТАК ЛЮБІЦЕ ЗДАГАДКІ, ПАСПРАБУЙЦЕ СКАЗАЦЬ КОЛЬКІ НАМ СПАТРЭБІЛАСЯ, КАБ ВАС ЗНАЙСЦІ, КАЛІ МЫ ДАВЕДАЛІСЯ ПРА ВАШАЕ ІСНАВАННЕ.
ТРЫ ТЫДНЯ.
ДАКЛАДНЕЙ, ДВА З ПАЛОВАЙ.
МАГЧЫМА, У НАС НЕ АТРЫМАЕЦЦА ВАС ЗАБІЦЬ, АЛЕ, ЯК Я ЎЖО КАЗАЎ, МЫ ЗАЙМАЕМСЯ ГЭТЫМ ВЕЛЬМІ ДОЎГА, І Ў НАС ВЕЛЬМІ ДОЎГІЯ РУКІ. МЫ МОЖАМ ЗРАБІЦЬ ВАША ЖЫЦЦЁ ВЕЛЬМІ НЕПРЫЕМНЫМ І БАЛЮЧЫМ, СПАДАРЫНЯ ДЖОНС.
І ТЫХ, ХТО ДЛЯ ВАС ШТОСЬЦІ ЗНАЧЫЦЬ...
ТАКІМ ЧЫНАМ, ВАШ АДКАЗ?


ВЕДАЕЦЕ, ГЭТА ПАЦЕШНА... УВЕСЬ ЧАС, З ТАГО МОМАНТУ, ЯК Я СТАЛА ТАКОЙ, Я ЗАЎСЁДЫ ЧАКАЛА, ШТО ВЫ З'ЯВІЦЕСЯ.
НУ, НЕ ДАКЛАДНА ВЫ, А ЛЮДЗІ, ПАДОБНЫЯ НА ВАС – ЯКАЯ-НЕБУДЗЬ БАНДА, С КОЛЛЕМ У РУКАХ, СЯКЕРАМІ І БУТЭЛЬКМІ СА СВЯТОЙ ВАДОЙ. Я МАЮ НА ЎВАЗЕ, Я ВЕДАЛА, ШТО ВЫ ІСНУЕЦЕ ДЗЕСЬЦІ.
І ГЭТА МЯНЕ ПУЖАЛА. МНЕ НАВАТ БЫЛО ЦІКАВА, ЦІ АДЧУЮ Я ВАШАЕ ПРЫБЫЦЦЁ? ЦІ АДЧУЮ Я, КАЛІ МНЕ КАНЕЦ?
І, СКАЖУ ВАМ ПА САКРЭТУ, Я НАВАТ ДУМАЛА, ЦІ БУДЗЕ ГЭТА ДРЭННА – ТОЕ, ШТО ВЫ МЯНЕ ЗАБ'ЯЦЕ.
БО ВЫ МАЕЦЕ РАЦЫЮ НАКОНТ КРЫВІ.
У ЁЙ ЁСЦЬ ЦЕМРА. Я АДЧУВАЮ ЯЕ ЗАЎСЁДЫ, ЯНА ЗАЦЯГВАЕ МЯНЕ. І ГЭТА ПУЖАЕ МЯНЕ.
БЫВАЮЦЬ ДНІ, КАЛІ МНЕ ПРЫХОДЗІЦЦА НАГАДВАЦЬ САБЕ ПРА ТОЕ, ХТО Я. ЗНОЎ І ЗНОЎ.
ФАКТЫЧНА, Я НІКОГА НЕ ЗАБІВАЛА З 1925 ГОДА. Я СПРАБУЮ ЖЫЦЬ ДОБРЫМ ЖЫЦЦЁМ З ЧАЛАВЕКАМ, ЯКОГА КАХАЮ.
І ЧАСАМ, ДУМАЮ, Я ПЕРАСТАЛА ТУРБАВАЦЦА ЗА ТОЕ, ШТО ВЫ МОЖАЦЕ ПРЫЙСЦІ.


ДЗІЎНАСЦЬ У ТЫМ, ШТО НАВАТ ТАДЫ, КАЛІ ВЫ МЯНЕ ЯШЧЭ НЕПАКОІЛІ, У СВАІХ САМЫХ АДВАЖНЫХ ДУМКАХ, Я НЕ ЎЯЎЛЯЛА, ШТО ВЫ МОЖАЦЕ З'ЯВІЦЦА Ў МЯНЕ НА ПАРОЗЕ, КАБ ПРАПАНАВАЦЬ МНЕ ПРАДАЦЬ СКІНЭРА СВІТА.
СВІТ ДЭМАН, МОНСТАР! КАЛІ ЛАСКА...
ТАК, ЁН ЖУДАСНЫ, І НІХТО НЕ ВЕДАЕ ПРА ГЭТА ТАК ДОБРА, ЯК Я. АЛЕ, ДОБРА ГЭТА, ЦІ ДРЭННА, ЁН ДАЎ МНЕ ГЭТАЕ ЖЫЦЦЁ. І, ЯКІМ БЫ АГІДНЫМ ЁН НІ БЫЎ, Я НЕ ЗБІРАЮСЯ ЗДАВАЦЬ ЯГО ТЫПАЎ КШТАЛТУ ВАШАГА.
ТАМУ, МОЙ АДКАЗ – НЕ. МЯНЕ НЕ КУПІЦЬ. ПАСПРАБУЙЦЕ ДЗЕНЕБУДЗЬ У ІНШЫМ МЕСЦЫ.
ГЭТА ВАША РАШЭННЕ, СПАДАРЫНЯ ДЖОНС. А НА ВЫПАДАК, КАЛІ, УСЁ Ж ТАКІ, ВЫ ПЕРАДУМАЕЦЕ – МЫ БУДЗЕМ У ГАТЭЛІ «БАНГЭЙ ДЖАР» ДА ЗАЎТРАШНЯЙ РАНІЦЫ.
ВЫ ПАШКАДУЕЦЕ АБ ГЭТЫМ, ДЖОНС. Я АБЯЦАЮ.
Я ПАКУЛЬ СУМНЯВАЮСЯ!
УЯЗДЖАЙЦЕ ЗАРАЗ ЖА, ПАКУЛЬ ЦЭЛЫЯ!


УСЁ ЯШЧЭ НІ СЛОВА АБ ІСБЭЛЕ, ГЛЕН?
НІЧОГА. МЯРКУЮ, ЁН ПРОСТА ЗБЕГ, САБРАЎ РЭЧЫ І РУШЫЎ НА ЎСХОД. Я Б ЗРАБІЎ ТАК, КАЛІ Б ХТОСЬЦІ ЗАБІЎ ДВУХ МАІХ ПАРТНЁРАЎ З ТРОХ.
ПРАЦЯГВАЙ СПРОБЫ. КАЛІ ЁН ВОЗЬМЕ ТРУБКУ, СКАЖЫ, КАБ ЯК МАГА ХУТЧЭЙ БЫЎ У АДДЗЯЛЕННІ, КАБ МЫ МАГЛІ АБАРАНІЦЬ ЯГО, АД ТАГО, ЧЫМ БЫ ГЭТА НІ БЫЛО.
А Я НАВЕДАЮ-СЯ Ў «НЕРУХО-МАСЦЬ ГРЭЙСІ».
ХТО.
ШТО?
ХТО Б ГЭТА НІ БЫЎ. ТЫ СКАЗАЎ «ШТО БЫ ГЭТА НІ БЫЛО».
ПРАЦЯГВАЙ СПРОБЫ.
БУДЗЬ ЯНО НЯ ДОБРА.
ПОЙДЗЕМ, У НАС ЯШЧЭ ВЫЯЗД.
ШТО ПАЎПЛЫВАЛА НА ВАС?
А ХТО СКАЗАЎ, ШТО ШТОСЬЦІ ЗМЯНІЛАСЯ? ЗАЎТРА Я ВАС ЗДАМ, АЛЕ СЁННЯ НАМ ТРЭБА СХАПІЦЬ ЗАБОЙЦУ, І, ЦІ ВАМПІР ЁН, ЦІ НЕ, ЁН РУХАЕЦЦА ХУТКА. МНЕ СПАТРЭБІЦЦА ЛЮБАЯ ДАПАМОГА.



ПАЕДЗЕМ ПА ШАШЫ 35 ЦІ 12, МІСТАР ІСБЭЛ?
ПА ТОЙ, ЯКАЯ ХУТЧЭЙ ВЫВЯДЗЕ НАС АДСЮЛЬ, НІГЕЛЬ.
Я ТАБЕ ТАК СКАЖУ, ХЛОПЕЦ – ЛЮДЗІ КАЖУЦЬ...
БАМП
БОЖА! ШТО ГЭТА БЫЛА ЗА ТРЫЗНА!
НІГЕЛЬ?
СКРЫЫЫЫЫЫ


ГЭТА НІЧОГА НЕ МЯНЯЕ.
НАВАТ КАЛІ ЎЯВІЦЬ УСЯГО НА АДНУ СЯКУНДУ, ШТО ЗАБОЙЦА – ГЭТЫ «ВАМПІР, ЯК ВАША АРГАНІЗАЦЫЯ ЗДАГАДАЛАСЯ ДАСЛАЦЬ ВАС СЮДЫ ДА ТАГО, ЯК ПАЧАЛІСЯ ЗАБОЙСТВЫ?
КАЛЯ МЕСЯЦА НАЗАД, З НАДЗЕЙНАЙ КРЫНІЦЫ МЫ ДАВЕДАЛІСЯ, ШТО АДЗІН З РЭДКАГА ВІДУ ВАМПІРАЎ, СА СТАРЭЙШЫХ, ПАСЯЛІЎСЯ Ў ЛАС ВЕГАСЕ.
ЧАМУ ЯНО АБРАЛА ГЭТЫ ГОРАД І ГЭТЫХ ЛЮДЗЕЙ, МЫ ПРОСТА НЯ ВЕДАЕМ.
ПАЧАКАЙЦЕ, ГЭТА ШТО… МАШЫНА?


КАБУЎМ
ТЫ БАЧЫШ ЯГО?
НЕ, НІЧОГА.
НУ, МЫ ВЕДАЕМ, ШТО Ў ЯГО ЁСЦЬ КРЫЛЫ. ГЭТА МОГ БЫЦЬ ХІРАПТЭРУС, АЛЕ З ЯКІМ МОЦАМ ЁН ПАДНЯЎ МАШЫНУ...
ЛІМУЗІН БЛЭЙНА ІСБЕЛА.
ЗАСТАЎСЯ АПОШНІ, МЫ ПАВІННЫ ЯГО АБАРАНІЦЬ. ТОЛЬКІ СКАЖЫЦЕ МНЕ – ВЫ Ж ВЕДАЕЦЕ ЯК ГЭТА ЗАБІЦЬ, ТАК?
ВІТАЕМ У НАШАЙ ЮРЫСДЫКЦЫІ, ШЭФ МАККОГАН.


Эрроўхэд, Каліфорнія.
СКРЫЫЫПП
ХТО ТУТ?
З'ЯВІСЯ!
Я АДЗІН.
МІСТАР ПРЭСТАН, ПРАБАЧЦЕ, Я ДУМАЛА...
КАЛІ Я...
КЛЯНУСЯ ТРУНОЙ МАЙГО МУЖА.
КАЛІ Я СКАЖУ ВАМ ТОЕ, ШТО ВЫ ХОЧАЦЕ ВЕДАЦЬ... АБЯЦАЙЦЕ МНЕ...
АБЯЦАЙЦЕ, ШТО НІХТО НЕ ЗРОБІЦЬ ШКОДЫ ПЕРЛ. НІ ВЫ, НІ ВАШЫЯ ЛЮДЗІ, НІ ХТОСЬЦІ ЯШЧЭ. НІКОЛІ. КЛЯНІЦЕСЯ.


Лас Вегас, Невада.
МІСТАР ГРЭЙСІ, АДЧЫНЯЙЦЕ!
ВЫ Ў НЕБЯСПЕЦЫ. ТРОЕ ВАШЫХ ПАРТНЁРАЎ ПА КАНСОРЦЫЮМУ ПАМЕРЛІ І...
ЗНАЧЫЦЬ, І ДА ІСБЕЛА ДАЦЯГНУЎСЯ. ЗАХОДЗЬЦЕ, ХУТКА.
МЫ СПРАБАВАЛІ ТЭЛЕФАНА-ВАЦЬ, АЛЕ...
Я НЕ МАГУ ДАЗВОЛІЦЬ САБЕ АДКАЗВАЦЬ НА ТЭ-ЛЕФОН, ШЭФ. МЫ ТУТ ЦІШЭЙ ВАДЫ.
ГЭТА ПРАВІЛЬНА, АЛЕ, МНЕ ЗДАЕЦЦА, ВЫ БЫЛІ Б У БОЛЬШАЙ БЯСПЕЦЫ Ў ПАЛІЦЫІ, З НАМІ, ПАКУЛЬ МЫ НЕ РАЗБЯРЭМСЯ Ў ТЫМ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА.
А Я СКАЖУ ВАМ, ШЭФ, ШТО АДБЫВА-ЕЦЦА. МЫ НА ВАЙНЕ.
НА ВАЙНЕ З ЧОРТАВЫМ МОН-СТРАМ З ПЕКЛА.


ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ, ВЫ ВЕДАЕЦЕ.
ШТО, ПРА ВАМПІРАЎ?
БОЖА МОЙ. А ХТО, ПА-ВАШАМУ, ПЕРАКАНАЎ ІХ ІНВЕСТЫРЫВАЦЬ СЮДЫ ГРОШЫ?
ІНВЕСТЫРЫВАЦЬ ГРОШЫ? ПРА ЯКІЯ, ЧОРТ ВАС БЯРЫ, ГРОШАХ ВЫ ГАВОРЫЦЕ?
ГЭТА ПРОСТА, ШЭФ МАККОГАН. НАВАТ СКЛАЎШЫСЯ РАЗАМ, НАШЫЯ ЧАТЫРЫ КАМПАНІІ НЕ МАГЛІ ПАСТАВІЦЬ СТОЛЬКІ, КАБ ПЕРАМАГЧЫ Ў ТЭНДАРЫ І АБЫЙСЦІ ВЯЛІКІХ ХЛОПЦАЎ.
АЛЕ КАЛІ Б ХТО-НЕБУДЗЬ ЯШЧЭ, ЯКІ-НЕБУДЗЬ НЕРАСКРЫТЫ ПАРТНЁР ДАДАЎ БЫ СЕМ, ЦІ НАВАТ СЕМ З ПАЛОВАЙ МІЛЬЁНАЎ...
...ТАДЫ НАША НЕВЯЛІКАЯ СУПОЛКА МАГЛА БЫ СПАКОЙНА РУШЫЦЬ У КАПІТОЛІЙ З НАМЕРАМ ПАБУДАВАЦЬ ДАМБУ НА ПЯЦЬДЗЕСЯТ МІЛЬЁНАЎ ПА КОШЦЕ САРАКА.
КАНСОРЦЫЎМ З ЧАТЫРОХ КАМПАНІЙ, ПАД ЯКОЙ ЯКІМІ ПАДПІСАЛАСЯ ТАЕМНАЯ ПЯТАЯ - БАНК...
ЯКІ НАЛЕЖЫЦЬ МОНСТРАМ.


ВЫ ЎЗЯЛІ ГРОШЫ Ў МОНСТРАЎ, КАБ ВЫСТАВІЦЬ СВОЙ КОШТ ЗАНАДТА НІЗКІМ І АБЫЙСЦІ ЗАКОН. ВЫ ПРЫВЯЛІ ІХ У НАШ ГОРАД...
МАГЧЫМА, КРОЎ У ІХ І ЧОРНАЯ, АЛЕ ІХ БАКСЫ ТАКІЯ Ж ЗЯЛЁНЫЯ, ЯК ВАШЫ.
ЦІКАВА, АЛЕ ЯНЫ АКАЗАЛІСЯ ІДЭАЛЬНЫМІ ПАРТНЁРАМІ.
СКАЖЫЦЕ ГЭТА БЭЛЬЮ, ФІЛМАТУ І ІСБЕЛУ.
ЗАБОЙСТВА - СПРАВА НЕ НАШАГА НЕАБВЕСНАГА ПАРТНЁРА. НАШЫ ХЛОПЦЫ ТАК САМА ЖАДАЮЦЬ СПЫНІЦЬ ЗАБОЙСТВЫ, ЯК І ВЫ. ДУМАЙЦЕ, ШТО ХОЧАЦЕ. АЛЕ ГЭТА НЕ ПАДМАН.
НЕ, ГЭТА ВАМПІРСКАЯ РАЗБОРКА. І З-ЗА ВАС ГОРАД АКАЗАЎСЯ ПРАМА Ў ЯЕ ЭПІЦЭНТРЫ.
Я ЎЧЫНІЎ СПРЫТНУЮ СПРАВУ ДЛЯ СВАЙГО ГОРАДА. ХТО Б НІ РАБІЎ ГЭТА... ГЭТА ПРОСТА ІЛЖЫВАЯ СПРОБА НАПУЖАЦЬ НАС УСІХ...
ЁН ХОЧА ВАЙНЫ, ТАДЫ, ЧОРТ БЯРЫ, ЁН ЯЕ АТРЫМАЕ. БАЧЫЦЕ МАЮ ФОРМУ? Я БЫЎ ТАМ, БЫЎ У ЛЯСАХ АРГОННЫ... Я БАЧЫЎ МАЮ...
ТЫДЫШЧ
ГУК ЙШОЎ АДТУЛЬ!


ТАМ! ПРАМА ТУДЫ!
СПЫНІЦЕ СТАЛЬ-БУ.
Я ТУТ НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ РАБІЦЬ ШКОДУ.
БАЦЬКА?
СТОЙ, БАЦЬКА... КАЛІ ЛАСКА!
НЕ ТУРБУЙСЯ, СЫН. Я Ж СКАЗАЎ, Я ПРЫЙШОЎ НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ РАНІЦЬ КАГО-НЕБУДЗЬ...
АКРАМЯ ЯГО.


СКРЫЫЫЫЫ!
ЁН ЗАБІЎ ГРЭЙСІ! СПЫНІЦЕ ЯГО!


Эрроўхэд, Каліфорнія.
ГАТЭЛЬ ДЭЛЬ-МУР, ЛАС ВЕГАС, НЕВАДА, КАЛІ ЛАСКА.
МАГУ Я ПАГАВАРЫЦЬ З МІС БУК З ПАКОЯ 215? ГЭТА ЯЕ МАЦІ.
ЯЕ НЯМА. А Я МАГУ ПАКІНУЦЬ ЁЙ ПАВЕДАМЛЕННЕ.
ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАКОЕ: МЫ ЗНАЙШЛІ ПАДАРУНАК ДЛЯ МІСТАРА СВІТА. ЯНА ЗРАЗУМЕЕ, ШТО ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ...
Працяг будзе...